

# Лекавыя расліны

*"Пасярод вуліцы яго, і па той бок ракі і па гэты, дрэва жыцьця, якое дванаццаць разоў родзіць плады, дае на кожны месяц плод свой; і лісьце дрэва – на ацаленьне народаў"*
*(Адкрыцьцё 22:2)*



- На першых старонках Бібліі мы знаходзім згадкі пра расліны. Бог стварыў траву і дрэвы на трэці дзень (Быццё 1:11), аднак некаторыя расліны з'явіліся пазней, як праклён за грэх прабацькоў (Быццё 3:18).
- Першапачаткова Бог зрабіў расліны ежай для людзей і жывёл (Быццё 1:29-30). І толькі пасля Патопу людзі атрымалі дазвол ужываць у ежу "усё, што рухаецца, што жыве" (Быццё 9:3).
- Госпад заклаў у расліны вялікую колькасць карысных рэчываў, якія здольныя і насыціць чалавека, і дапамагчы ў хваробах.





# Цудадзейныя расліны

- Мы выкарыстоўваем расліны вельмі часта: для ежы, для вырабу вопраткі, для будаўніцтва, для лекавання.
- Некаторыя з раслінаў можна назваць цудадзейнымі, бо яны вельмі дапамагаюць чалавеку – лечаць шмат хваробаў. Такія расліны збіраюць у адпаведны час, а пасля робяць з іх лекі, адвары і гарбаты.





# Ліпа

- Гэта прыгожае дрэва з цёмнай карой і пышнай кронай.
- Гарбату з ліпавых кветак добра піць пры прастудзе.
- Ужываюцца пры лячэнні таксама пупышкі, лісце, кара, насенне.









# Багульнік

- Назва ўтварылася ад слова "*багуліць*" – атручваць. Расце на балотах, валодае моцным пахам.
- У медыцыне выкарыстоўваецца лісце, сцеблы, кветкі багульніка. Ён дапамагае пры кашлі.





# Крываўнік

- У народзе яго называюць салдацкай травой – ён спыняе крывацёк і загойвае раны. Крываўнік вынослівы, адважны, не баіцца ні спякоты, ні маразоў, ні дрэнных глебаў.
- Яшчэ адна яго назва "Ахілесава трава".
- У медыцыне выкарыстоўваюцца сцеблы, лісце, кветкі.






# Крапіва

- Гэта і пустазелле, і лекі адначасова. Яе старажытная назва ад слова "*копрына*" – ядваб. З яе сцеблаў атрымлівалі валакно для выпрацоўкі тканін – узгадайце Андэрсана і яго "Дзікіх лебедзяў".
- Гэта расліна ўмее спыняць крывацёк і насычае наш арганізм вітамінамі. З крапівы вараць супы.
- У медыцыне выкарыстоўваецца лісце і карані.



# Чыстацел

- Гэта шырока вядомая ў народзе расліна з ярка-жоўтымі кветкамі і спецыфічным, але прыемным пахам. Чыстацел выкарыстоўваюць пры кашлі, пры болях у страўніку і кішачніку.
- У медыцыне выкарыстоўваюцца сцеблы, лісце, кветкі.





# Бяроза

- Няма дрэва лепш за бярозку. Бяроза значыць светлая, белая. Бярозка не толькі прыгажуня, але і выдатны лекар. Лісце бярозы дапамагае зняць ацёкі.
- У медыцыне выкарыстоўваюцца пупышкі і лісце.





# Мята

- Мята шырока ўжываецца ў медыцыне. Паляпшае апетыт і страваванне, спыняе спазмы страўніка, валодае абязбольвальным дзеяннем.
- Настой з мяты ўжываюць пры кашлі і галаўным болю.
- У медыцыне выкарыстоўваюцца сцеблы, лісце, кветкі.








# Сасна

- Іглічнае дрэва з чырвона-бурай карой. Вышыня да 40 м. Адвар з пупышак прымаюць пры бранхіце, рэўматызме, і асабліва пры недахопе вітаміна С. Адвар выкарыстоўваюць для інгаляцый пры кашлі.
- Карысна таксама проста гуляць у сасновым лесе.
- У медыцыне выкарыстоўваюцца маладыя парасткі і igліца.





# Рамонак

- Аптэчны рамонак адрозніваецца ад звычайнага рамонка моцным араматычным пахам.
- Рамонак шырока ўжываюць у медыцыне: пры болях у страўніку, для паласкання горла і прамывання ран, язваў і нарываў.
- Калі пры мыцці светлых валасоў паласкаць іх настоем з рамонка з часам яны набудуць прыгожы залацісты колер.
- У медыцыне выкарыстоўваюцца кветкі.





# Шыпшына

- Шыпшына – і лекавая, і дэкаратыўная расліна. Яна дае цудоўны смачны мёд і мае ў сабе шмат вітамінаў.
- Ад шыпшыны людзі бяруць маладыя парасткі і ягады.
- Шыпшына – гэта крыніца жыццёва неабходных для чалавека вітамінаў.





# Лапух

- Лапух вялікі - каштоўная лекавая расліна. Ён лечыць многа цяжкіх хваробаў. У народзе яго часцей лічаць дакучлівым, бо лапух любіць чапляцца сваімі кветкамі-калючкамі да вопраткі.





# Календула

- Календула – гэта аднагадовая травяністая расліна, якую можна ўбачыць на кветніках, у парках, на лецішчах.
- Календула дапамагае пры хваробах скуры і язвах.
- Часам гэту расліну называюць "кіпцікі" з-за формы насення.
- У медыцыне выкарыстоўваюцца кветкі.





# Падбел

- Падбел – гэта шматгадовая травяністая расліна.
- У медыцыне ўжываецца лісце – дапамагае пры захворваннях дыхальных органаў і хваробах страўніка і кішачніка.





# Дзьмухавец

- Дзьмухавец лекавы – гэта шматгадовая травяністая расліна. Дзьмухавец расце паўсюль і асабліва заўважны сваімі яркімі жоўтымі кветкамі.
- Дзьмухавец умацоўвае арганізм, таксама яго рэкамендуюць прымаць як снатворны сродак.
- З кветак дзьмухаўцоў вараць сочыва.





# МАЛАЙЦЫ!



